«Вясна» — «экстрэмісцкае фармаванне».
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Вярхоўны суд пакінуў без зменаў прысуд палітвязню Ціхану Осіпаву — яго этапуюць у калонію на 11 гадоў

30.07.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні



Ціхан Осіпаў. Фота: "Наша Ніва"

Сёння, 30 ліпеня, Вярхоўны суд разглядзеў апеляцыйную скаргу на прысуд 25-гадоваму Ціхану Осіпаву. За наезд на пяць вайскоўцаў падчас пратэстаў у жніўні мінулага года, удзел у масавых беспарадках, а таксама за ілжывы данос (пасля ДТЗ хлопец заехаў на машыне ў вадаём, пакінуў яе там і заявіў аб згоне) Мінгарсуд асудзіў Ціхана да 11 гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Ціхана абвінавацілі па трох артыкулах Крымінальнага кодэкса: па ч. 2 арт. 293, ч. 1 арт. 400, ч. 1 арт. 14 і арт. 362. Ён прызнаў віну толькі па арт. 400 Крымінальнага кодэкса, па іншых артыкулах не прызнаў. Сёння судовая калегія Вярхоўнага суда пакінула прысуд без зменаў — Ціхана этапуюць у калонію на 11 гадоў.

У судовую калегію, якая разглядала скаргу палітвязня на жорсткі прысуд, уваходзілі **Аляксей Рыбакоў** (старшынствуючы), **Андрэй Яфрэмаў, Сяргей Гураў.** У разглядзе справы ўдзельнічала пракурорка **Гаўрыленка.**

Падчас апеляцыі Ціхану Осіпаву пералічылі тэрміны згодна са зменамі ў Крымінальны кодэкс, па якіх 1,5 дзень у калоніі лічыцца як 1 дзень у СІЗА. Пад вартай Ціхан знаходзіцца з 11 жніўня.

Калегія пакінула пакаранне без зменаў, але выключылі адну фармуліроўку, якая тычыцца галоўнага абвінавачвання па ч. 1 арт. 14 і арт. 362 (замах на забойства супрацоўнікаў АУС). Так, выключылі ўзгадвадванне пра тое, што машына Ціхана непасрэдна перад наездам на сілавікоў набрала хуткасць. Як адзначыла пракурорка, Мінгарсуд выйшаў за межы сваёй кампетэнцыі, калі пазначыў гэты факт.

У чым абвінавацілі Ціхана?

Нагадаем, згодна з версіяй абвінавачвання, у ноч з 10 на 11 жніўня «паддаўшыся на заклікі дэструктыўных тэлеграм-каналаў, каля гадзіны ночы 25-гадовы мінчук прыехаў на вуліцу Прытыцкага ў Мінску для ўдзелу ў масавых беспарадках. Малады чалавек знаходзіўся за рулём свайго BMW, з якога папярэдне зняў рэгістрацыйныя знакі. Ігнаруючы патрабаванні міліцыі, кіроўца адмовіўся адчыніць дзверы і застаўся сядзець у машыне. Пасля крануўся з месца і збіў **пецярых вайскоўцаў унутраных войскаў**. Наезд быў здзейснены на вайскоўцаў унутраных войскаў МУС, якія знаходзіліся ў форменным абмундзіраванні і якія прымалі ўдзел у ахове грамадскага парадку».

Паводле версіі следства, мужчына схаваўся з месца здарэння, кінуў аўтамабіль у вадаёме недалёка ад месца здзяйснення злачынства. З мэтай стварэння алібі патэлефанавала ў 102 і заявіў аб згоне. Будучы папярэджаным аб крымінальнай адказнасці за загадзя ілжывы данос, паведаміў недакладную інфармацыю пра абставіны перамяшчэння аўтамабіля і папрасіў арганізаваць яго пошук.

Пацярпелымі выступаюць вайскоўцы-кантрактнікі вайсковай частцы 5524 **Васільчанка, Астапенка, Протас, Воліс, Ляпёшкін**. Яны заявілі патрабаванні аб кампенсацыі маральнай шкоды: Васільчанка — 500 рублёў, Воліс, Ляпёшкін, Ратас, Астапенка — па 200 рублёў. Усе сумы кампенасаваныя да суда. Усе пацярпелыя на судзе заявілі, што прэтэнзій да абвінавачанага не маюць.

25-гадовага Ціхана Осіпава судзілі ў красавіку Мінскім гарадскім судзе за наезд на пяць вайскоўцаў падчас пратэстаў у жніўні мінулага года. Судовы працэс прайшоў цалкам, у спрэчках пракурор запрасіў для абвінавачанага 12 гадоў калоніі, а адвакат заявіў, што Осіпаў злачынства не здзяйсняў. Заставалася толькі абвясціць прысуд, аднак гэтага не адбылося: крымінальную справу пачалі разглядаць зноўку, з іншымі

суддзёй і народнымі засядацелямі. Пасля аднаўлення судовага следства быў заменены суддзя з **Дзмітрыя Цыкала** на **Пятра Арлова**. Другое паседжанне прайшло спачатку і яно было амаль індэнтычным першаму: тыя ж допыты і пытанні. Пацярпелыя вайскоўцы амаль нічога новага не паведамілі суду.


19 траўня быў вынесены прысуд па справе. **Па ч. 2 арт. 293 КК Ціхана Осіпава асудзілі да 4 гадоў калоніі, па ч.1 арт. 400 — да 1 года, па ч.1 арт. 14 і арт. 362 — да 10 гадоў, сумарна — 11 гадоў пазбаўлення волі. Маральную шкоду пацярпелым вайскоўцам у агульнай суме 1300 рублёў ён кампенсаваў да суда.**

Храналогія судоў над Ціханам Осіпавым:



Мінчука судзяць за наезд 11 жніўня на пецярых вайскоўцаў. Яму пагражае да 25 гадоў турмы

У Мінскім гарадскім судзе 12 красавіка пачаўся разгляд крымінальнай справы супраць 25-гадовага інжынера БНТУ Ціхана Осіпава.



Пракурор запрасіў 12 гадоў калоніі для мінчука, якога судзяць за наезд на BMW 11 жніўня на вайскоўцаў

У Мінскім гарадскім судзе 20 красавіка адбываюцца судовыя спрэчкі па крымінальнай справы супраць 25-гадовага інжынера БНТУ Ціхана Осіпава.



Сёння не вынеслі прысуд мінчуку за наезд на BMW 11 жніўня на вайскоўцаў — калегія аднавіла судовае следства па справе

У Мінскім гарадскім судзе 27 красавіка мусілі вынесці прысуд па крымінальнай справы супраць 25-гадовага інжынера БНТУ Ціхана Осіпава.



"Не было ў яго намеру". Пачаўся паўторны суд над кіроўцам BMW за наезд на пецярых вайскоўцаў 11 жніўня

У красавіку 25-гадовага Ціхана Осіпава судзілі ў Менскім гарадскім судзе за наезд на пяць в




Кіроўцу BMW асудзілі да 11 гадоў калоніі за наезд на пецярых вайскоўцаў на жнівеньскім пратэсце

Сёння, 19 траўня, Мінскі гарадскі суд вынес прысуд 25-гадоваму Ціхану Осіпаву за наезд на пяць вайскоўцаў падчас пратэстаў у жніўні мінулага года, удзел у масавых беспарадках, а таксама за ілжывы данос: пасля ДТЗ хлопец заехаў на машыне ў вадаём, пакінуў яе там і заявіў аб згоне.



Вясна. Правы чалавека ў ...
10 248 подписчики

Подписаться на Страницу




СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Эколага з Мядзеля судзяць за "неаднаразовае пікетаванне" і "дыскрэдытацыю Беларусі"

За пратэсты 2020 года ў Брэсце асудзілі яшчэ 6 чалавек

У Брэсце асудзілі ўжо 11-ю групу за "грубае парушэнне парадку" ў 2020 годзе

У Брэсце яшчэ 5 чалавек асудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту 10 жніўня 2020-га




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Не менш за 15 чалавек выйшлі на волю па заканчэнні тэрмінаў у кастрычніку, адна з іх — жанчына


Палітвязня Аляксандра Арановіча будуць судзіць па новай крымінальнай справе. З ім няма сувязі амаль 5 месяцаў

Праваабарончая праграма "Вясна"

Дзмітрый Канеўскі: "Прэсінг у дачыненні да сябе ў калоніі я адчуваў штодня"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

- Заява аб прызнанні 14 чалавек палітычнымі зняволенымі
- Блогера Паўла Спірына, які мусіў праз месяц выйсці на волю, зноў будуць судзіць
- "Стануць сябрамі камісій, назіральнікамі". Ветэранаў МУС задзейнічаюць у выбарах
- 31 палітзняволены вызвалены па памілаванні 7 лістапада
- У Беларусі за "здраду дзяржаве" асудзілі 88 чалавек

Не менш за 15 чалавек выйшлі на волю па заканчэнні тэрмінаў у кастрычніку, адна з іх — жанчына

12 праваабарончых арганізацый заклікалі дзяржавы падтрымаць зварот у Гаагу аб просьбе расследавання злачынстваў рэжыму Лукашэнкі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Кастрычнік 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

Московская Хельсинкская Группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

